

Пасяджэнне цэха.
Гравюра XVII ст.



**Аляксандр Доўнар,**
загадчык аддзела
гісторыі Беларусі
IX–XVIII стст. і археаграфіі
Інстытута гісторыі
НАН Беларусі, кандыдат
гістарычных навук, дацэнт

# Рамесніцкія цэхі гарадоў Беларусі – вытворчыя аб'яднанні XVI–XVIII стст.

У часы феадалізму «кожны чалавек, група, структура былі абавязаны дзейнічаць у адпаведнасці са сваім саслоўным статусам, які набываўся па праву нараджэння ці шляхам набыцця прывілеяў». Такая рэгламентацыя жыцця на ўзроўні карпарацыі «не столькі скоўвала чалавека (гэтую скаванасць ён, відаць, доўга суб'ектыўна не адчуваў), колькі надавала акрэсленую агульназначную форму яго паводзінам» [1].

Неабходна адзначыць, што правы і свабоды кожнага саслоўя не даваліся проста так. Прадстаўнік любой грамадскай групы не толькі карыстаўся імі, але і павінен быў даказаць сваё права на гэта, а таксама выконваць акрэслены шэраг абавязкаў. Структурна грамадства Беларусі ў XVI–XVIII стст. складалася са шляхты, духавенства, мяшчанства і сялянства. Абавязкам шляхты было кіраванне краінай і яе абарона як у ваенным, так і ў іншых планах; духавенства адказвала за духоўнае развіццё грамадства. Мяшчанства займалася гандлем і рамяством, сялянства – сельскай гаспадаркай. Нягледзячы на тое, што ў кожнага саслоўя быў свой комплекс правоў, які адпавядаў, на думку сучаснікаў, яго месцы ў грамадстве, у кожнага чалавека было пачуццё ўласнай годнасці. Пры гэтым трэба ўлічваць, што галоўным для тагачаснай асобы была роўнасць не ў агульным, абстрактным сэнсе, а ў рамках сваёй сацыяльнай супольнасці. Саслоўныя абмежаванні не расцэньваліся як парушэнні правоў чалавека, як нераўнапраўнае становішча: іх існаванне лічылася справядлівым і апраўданым з пункту гледжання функцыянальнага падзелу грамадства.

Нягледзячы на значную ролю сельскагаспадарчых занняткаў у жыцці горада, усё ж на працягу XVI–XVIII стст. аснову гарадской гаспадаркі ў Беларусі складалі рамяство і гандаль. У гэты час адбыліся значныя змены ў ступені іх развіцця і месцы ў соцыуме, ажыццяўляўся эвалюцыйны пераход рамеснікаў ад працы на замову (хоць яна таксама захоўвалася) да масавай працы на продаж, рынак.

Рамеснікі, асабліва тых гарадоў, якія мелі права на самакіраванне, для таго, каб адгарадзіцца ад канкурэнцыі сваіх калег – жыхароў іншых мясцовасцей, а таксама ад замежных майстроў і купцоў, аб'ядноўваліся ў прафесійныя вытворчыя саюзы – «сотні», «брацтвы», пазней – «цэхі». Гэта адбывалася звычайна ў межах адной прафесіі або некалькіх сумежных, прычым незалежна ад таго, знаходзіліся рамеснікі ў падпарадкаванні магістрата ці пражывалі на прыватнаўласніцкіх тэрыторыях. Цэхі былі арганізацыямі рамеснікаў, створанымі імі для адстойвання сваіх прафесійных і грамадскіх інтарэсаў у межах канкрэтнага горада. На тэрыторыі Беларусі падобныя рамесніцкія структуры ў XVI–XVIII стст. існавалі ў Брэсце, Ваўкавыску, Віцебску, Гродне, Давыд-Гарадку, Дзісне, Друі, Зэльве, Камянцы, Капылі, Клецку, Кобрыне, Койданаве (сучасным Дзяржынску), Любчы, Магілёве, Мазыры, Мінску, Міры, Міхалове, Мсцібаве, Навагрудку, Нясвіжы, Оршы, Пінску, Полацку, Слоніме, Слуцку, Шклове [2].

Кожная такая карпарацыя мела свой герб, штандар, цэхавую касу («скрынку»), што наглядна фіксавала яе статус. Звычайна ролю герба ў рамесных цэхах адыгрывалі сімвалічныя выявы прылад працы. Напрыклад, у аршанскіх краўцоў, пастрыгачоў і кушняроў, згодна з прывілеем ад 13 кастрычніка 1612 г., свой герб мела кожнае рамяство: адпаведна парцяжныя і пастрыгацкія нажніцы і рысь «расцягнутую» [3]. На сходах членам цэха не дазвалялася сядзець за сталом са зброяй, прыходзіць п'янымі, дрэнна апранутымі. На гарадскія святы ўсе яны ўбіраліся ў найлепшае адзенне і выходзілі на гарадскую плошчу пад асабістай харугвай, а заможныя старшыні і майстры выязджалі на конях.

Унутраны парадак цэха рэгламентаваўся яго «ўставай» (статутам), якая складалася самімі членамі аб'яднання і зацвярджалася гарадскім магістратам як прадстаўніком улады. Цэхавыя ўставы розных рамесніцкіх арганізацый адрозніваліся паміж сабой як па аб'ёме, так і па змесце. Напрыклад, у дакументах 1636 г. навагрудскіх злотнікаў і цырульнікаў утрымлівалася адпаведна 20 і 31 артыкулаў, а цэхавая ўстава навагрудскіх шаўцоў 1607 г. увогуле не была падзелена на артыкулы [4]; у Оршы ў цэхавым статуце шаўцоў змяшчалася 12 артыкулаў, шапашнікаў – 22, у той час як устава аршанскіх краўцоў не была гэтак структуравана.

Складанне цэхавай уставы было вельмі адказнай справай, таму што ў гэтым дакуменце ўтрымліваліся нормы грамадскага і прафесійнага жыцця ўдзельнікаў саюза. Пасля прыняцця рамеснікамі той ці іншай спецыяльнасці рашэння аб аб'яднанні ў прафесійную арганізацыю яе прадстаўнікі інфармавалі аб гэтым гарадскія ўлады. Атрымаўшы іх дазвол на ўтварэнне цэха, яны складалі праект статута і прасілі мясцовыя ўлады аб яго зацвярджэнні.

Такія праекты звычайна разглядаліся і абмяркоўваліся на пашыраных пасяджэннях гарадскога магістрата: «войтаўскага, радзецкага і лаўніцкага ўрадаў», «рады ўсёй гарадской супольнасці», «увесь цэлага грамадства …магістрат», – на якім прысутнічалі войт, бурмістры, радцы, лаўнікі і прадстаўнікі мяшчанства горада. Пры неабходнасці «парадак ці артыкулы» цэха праходзілі «слуханні» на некалькіх пасяджэннях магістрата пры шырокай прысутнасці гарадскіх жыхароў. Праекты цэхавых уставаў зачытваліся ўслых па некалькі разоў, абмяркоўваліся, у іх дадаваліся змяненні і дапаўненні. Прынятыя статуты ўносіліся ў гарадскія актавыя кнігі.

Пры стварэнні цэхаў маглі мець законную сілу рашэнні не толькі магістрата, але і іншых прадстаўнікоў улады, напрыклад старАст. Так, у 1625 г. рыбакі розных юрыдык (асобных адміністрацыйна і судова незалежных частак горада: магдэбургскай (гарадской), замкавай, прыватнай (шляхецкай), царкоўнай) Пінска, найперш замкавай і гарадской, сабраліся і вырашылі стварыць цэх, вызначылі прынцыпы вядзення рыбнай лоўлі і гандлю, выбралі сярод сябе старшага, які б ахоўваў інтарэсы цэха. Дадзеную пастанову зацвердзіў пінскі староста Ежы Збаражскі, бо бачыў, што ў «месце Пінскім вялікі непарадак між рыбакамі ў продажы рыб» быў, з-за чаго «дарагавізна там умножылася». У 1627 г. ліст Е. Збаражскага зацвердзіў кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Ваза [5].

У сувязі з тым, што ў цэхавых уставах змяшчалася інфармацыя, якая адносілася не толькі да жыхароў магдэбургскай юрыдыкі, але і да насельніцтва іншых частак горада і наваколля, магістрат звяртаўся да караля польскага, вялікага князя літоўскага з просьбай аб зацвярджэнні гэтых дакументаў, пасля чаго прадстаўнікі цэха са сваімі цэхавымі ўставамі і рэкамендацыямі («атэстацыяй») магістрата падавалі дакументы да манарха, які канчаткова яго ўзаконьваў. Кароль польскі, вялікі князь літоўскі адзначаў, што цэхавыя ўставы «правомъ волностям местскимъ и врадомъ и доброму посполитому местъскому шкодливые не суть». Пры гэтым у некаторых выпадках манарх не проста зацвярджаў прадстаўленыя яму цэхавыя уставы, але і ўключаў у іх тэкст змяненні ці дапаўненні і, як правіла, пашыраў і ўзмацняў правы і паўнамоцтвы рамеснікаў, што ўваходзілі ў цэхі (у прыватнаўладальніцкіх гарадах на ўставы цэхаў даваў «дабро» ўласнік горада).

Важнасць захавання прывілеяў і ўставаў цэхаў горада ў пісьмовай форме тлумачылася так: «бо ўсялякія вялікія і важныя справы, асабліва тыя, што людзям патрэбны і карысныя ў цяперашнія і будучыя часы, заўсёды заносяцца на паперу (заўсёды пісьмом зацверджаны бываюць), бо інакш бы людзі пра іх з цягам часу забывалі, з цягам часу яны б ад ведама і памяці людской сплывалі» [6].

Права на ўдзел у абмеркаванні і прыняцці цэхавых ўставаў мелі ўсе рамеснікі, што ўваходзілі (ці збіраліся ўвайсці) у адпаведную цэхавую арганізацыю. Так, напрыклад, падчас зацвярджэння ўставы шавецкага цэха ў навагрудскую ратушу прыйшлі рамеснікі-шаўцы, якія пражывалі ў гарадской, замкавай, плябанскай, мітрапалітаўскай юрыдыках: усяго 56 майстроў. У гэты лік не ўвашлі тыя, хто па розных прычынах не прысутнічаў на сходзе (хворыя, былі ў ад'ездзе і г.д.).

Паказальна, што ўстава цэха навагрудскіх шаўцоў 1607 г. была ўзгоднена таксама з ўладальнікамі юрыдык: Адамам Храптовічам, Пятром Неміровічам, Юзэфам Голубам, Янам Драчылоўскім, мітрапалітам Іосіфам Вельямінам Руцкім і віленскім біскупам Яўстафіем Валовічам. Подпісы ўласнікаў юрыдык служылі дазволам для рамеснікаў, што пражывалі на іх землях, на далучэнне да вышэйзгаданага цэха.

Звычайна рамеснікі складалі свае цэхавыя ўставы з улікам аналагічных дакументаў іншых гарадоў ВКЛ, найперш – па прыкладу сталічнай Вільні [7]. Так, у статуце шавецкага цэха Навагрудка 1607 г. адзначана, што тымі артыкуламі аб арганізацыі цэхавага жыцця, якія з той ці іншай прычыны не былі змешчаны ва ўставе, усё адно неабходна кіравацца так, як імі кіруюцца ў цэхах таго ж рамяства ў іншых гарадах, а менавіта ў сталіцы («артыкулы, которые-то з стороны порадку цехового не помянени, мают им служить, яко цехом того ремесла в иншых местах, а меновите яко в месте головном»).

Цэхавыя ўставы як дакументы, у якіх былі запісаны правы, ільготы цэха, прывілеі манарха, якія іх зацвярджалі, а таксама дазволеная ўладамі цэхавая атрыбутыка з'яўляліся найвышэйшай каштоўнасцю кожнага прафесійнага аб'яднання. Таму часта ў іх уставах прадугледжвалася, што ў памяшканні, дзе стаяла адчыненая цэхавая скрынка для захоўвання дакументаў, атрыбутыкі і каштоўнасцей, ніхто не меў права знаходзіцца са зброяй; тут было забаронена падвышаць голас, а члены цэха павінны былі стаяць, а не сядзець. За парушэнне гэтага парадку ў цэху цырульнікаў Навагрудка 1636 г. быў усталяваны штраф у памеры 10 злотых, у цэху злотнікаў – 3 грошы. Тым, хто ішоў на яшчэ большыя парушэнні, пагражала зняволенне.

Цэхі ствараліся не толькі для абароны ад канкурэнцыі, але і для паляпшэння ўмоў развіцця таго ці іншага віда рамяства ў горадзе. Так, навагрудскі шавецкі цэх 1607 г. быў створаны таму, што:

- *«добрым парадкам павінен кіравацца не толькі горад, а і яго асобныя часткі, бо інакш яны да заняпаду і знішчэння прыходзяць»;*
- *«для захавання паміж сабой адзінства, любові і братэрскай згоды»;*
- *для лепшай арганізацыі кантроля за яшчэ «недасканалай у тым рамястве моладзі»;*
- *для таго, каб пакараць свавольнікаў, «вынішчыць партачоў і п'янчугаў»;*

- *а таксама каб «узнагародзіць і пахваліць добрых людзей».*

Для арганізацыі паўнавартаснай дзейнасці аб'яднання перыядычна праводзіліся пасяджэнні яго членаў – «сходкі», на якіх павінны былі прысутнічаць усе майстры і таварышы цэха. На гэтых мерапрыемствах майстры мусілі «думаць пра жыццё ў адпаведнасці з боскімі запаведзямі, пра тое, як захоўваць парадак у сваім рамястве, якое справядліва і прыстойна, а не па-партацку, выконваць павінны («обмышлевать о побожном житию и захованию, о порадку в ремесле своем, которого бы побожне и цвичечне, а не партацко се справовало»). Іншымі словамі, задачаю вопытных рамеснікаў было разглядаць пытанні аб жыцці і дзейнасці цэха, усталяванні парадку ў сваім рамястве. Так, у кампетэнцыю сходу майстроў цэха шаўцоў (сапожнікаў) Оршы ўваходзіў разгляд пытанняў «около раженья добрых речей братских; около порадков цеховых и около обмысливания о размоитых припадках на потом приподаючихъ, которые бысе всех братства притрафить могли, которые будуть меть, тую моцъ иншую братью выступную и упорную на розсудок до враду меского отсылать…; такъ тежъ которые бы до брат» [8].

Вядома некалькі відаў цэхавых пасяджэнняў: перыядычныя, экстраныя, выбарчыя, урачыстыя, дзелавыя. Напрыклад, у Навагрудку тэрмін правядзення выбарчага сходу быў дакладна названы толькі ў статуце цэха шаўцоў – дзень Святога Крыжа. Злотнікі і цырульнікі пры неабходнасці павінны былі вызначыць дзень выбараў самастойна. Аршанскія краўцы збіраліся на генеральны сход на свята Святога Мікалая, а шаўцы – 11 студзеня кожнага года. Звычайныя агульныя цэхавыя сустрэчы павінны былі праходзіць кожныя 2 тыдні. Асобныя сходы мелі таварышы аршанскіх краўцоў; яны павінны былі праходзіць у прысутнасці двух старэйшых майстроў [9].

Цэхі злотнікаў і цырульнікаў Навагрудка праводзілі парадныя і штоквартальныя сходы. Шаўцы і цырульнікі збіраліся на дзелавыя пасяджэнні кожную нядзелю. Запрашэнні на сход па даручэнні цэхмайстраў разносілі малодшыя майстры.

Для ажыццяўлення жыццядзейнасці цэха, правядзення сваіх пасяджэнняў цэхі мелі права пабудаваць, набыць ці арандаваць дом. У цэхавым доме захоўваліся скрынка, прывілеі, атрыбутыка і іншыя рэчы арганізацыі. Каралеўскімі прывілеямі такія будынкі былі вызвалены ад падаткаў за карыстанне імі, а таксама ад вайсковых пастояў.

На цэхавыя сходы забаранялася прыходзіць нападпітку, са зброяй (нават з нажом), што падкрэслівала важнасць «сходак» і рашэнняў, якія на іх прымаліся. Гэтыя сустрэчы былі, па сутнасці, абавязковымі для ўсіх членаў цэха: за няяўку ці спазненне яны караліся даволі высокімі штрафамі. Так, у цэха злотнікаў Навагрудка ў 1636 г. штраф за першую няяўку на пасяджэнне складаў 3 грошы, за другі раз – 6 грошаў, за трэці – 12 і г.д.

Члены карпарацыі часта праводзілі разам не толькі працоўны, але і вольны час, святы. Так, у статуце навагрудскіх цырульнікаў прыгадваецца «таварыскі стол». Цэхі злотнікаў і цырульнікаў таго ж горада ў 1636 г. у выпадку адсутнасці асобнага цэхавага дома мелі права лічыць ім дом аднаго са сваіх цэхмайстраў.

Як правіла, у гарадах Беларусі кіраўніцтва такімі прафесійнымі саюзамі ажыццяўлялі органы цэхавага самакіравання, у якія ўваходзілі па два старэйшыя



Цэхавая ўстава навагрудскіх шаўцоў 1607 г. (копія)



Прывілей на кравецкі цэх Мінска 1591 г. з пячаткамі войта і магістрата



Запіс аб выбранні цэхмайстраў у г. Магілёве. 18 студзеня 1740 г.

майстры (цэхмайстры, старасты). Цэхмайстры павінны былі быць «людзьмі добрымі, аселымі, парадак і згоду любячымі, гораду прысяглымі». Асноўнымі іх абавязкамі было судзіць, караць і сачыць за дакладным выкананнем прафесійных абавязкаў членамі цэха (павінны «радзіць, караць і паслуг братэрскіх пільна даглядаць»).

Парадак выбараў цэхмайстраў у розных цэхах гарадоў Беларусі не быў аднастайны. Звычайна самі майстры выбіралі штогод сваіх цэхавых службоўцаў, якія потым, у адпаведнасці з магдэбургскім правам, прыносілі прысягу. У навагрудскім шавецкім цэху ўсталяваўся адметны парадак выбару старастаў: кожны год выбіраліся па два старасты – адзін быў адказны за брацкую скрынку (грамадскія складанкі), другі – за цэхавую, прафесійную. Старасту выбіралі з кожнай юрыдыкі «альтернатою… то естъ одного року з местское, другого зъ замъковое, третее з митрополие юрысдыкцыи». Астатнія навагрудскія цэхі сваіх цэхмайстраў выбіралі з прадстаўнікоў магістрацкай юрыдыкі. У 1636 г. згадваюцца чатыры старшыя навагрудскія злотнікі: Міхал Сымеін Вільгельмавіч, бурмістр; Ян Коканаевіч, Мікалай Цішкоўскі і Крыштаф Спарышэвіч; а таксама чатыры старшыя майстры навагрудскіх цырульнікаў: Міхал Эрнэст, Пётр Хіліцкі, Ежы Болт, Яраш Марунскі.

Выбраныя цэхамі цэхмайстры давалі прысягу гораду перад магістратам. Запіс ад 3 ліпеня 1777 г. у магістрацкіх кнігах Пінска засведчыў, што ў прысутнасці кожнага з цэхаў прысягнулі кавальскі, рымарскі, шавецкі, кушнерскі, рэзніцкі цэхмайстры [10]. 11 чэрвеня 1782 г. перад ландвойтам выканаў прысягу на цэхмайстарства кравецкага, кушнерскага, ткацкага, муральскага цэха Пінска Аляксандр Ладко [11]. А 18 жніўня 1789 г. на пасяджэнні войтаўскага суда Пінска пад старшынствам ландвойта на кіраўніцтва муральскім аб'яднаннем даў гэткую ж клятву Матэуш Скабарэвіч [12]. З апошніх двух прыкладаў бачна, што з цягам часу з саюзаў, у якія аб'ядноўваліся рамеснікі розных спецыяльнасцей, вылучаліся аб'яднанні асобных з іх, як у дадзеным выпадку з муральскім цэхам Пінска.

Цэхмайстры павінны былі рэгуляваць дзейнасць цэха: размяркоўваць працу, сачыць за якасцю прадукцыі, ажыццяўляць збор і выдаткаванне сродкаў на патрэбы цэха і г.д. У сувязі з гэтым штогод падчас выбараў яны рабілі справаздачу аб прыходах і расходах грошай сваёй скрынкі «перед братею», а калі хто-небудзь нешта «не вылічыў» ці зрабіў шкоду, то павінен быў вярнуць адным разам падвойную суму страчанага са сваёй маёмасці паводле брацкага суда. Спаганяць гэтую суму быў абавязаны нованыбраны цэхмайстр.

Цэхі гарадоў Беларусі часоў ВКЛ усталёўвалі і падтрымлівалі манаполію ў горадзе адносна свайго віда рамяства. Але разам з тым неслі адказнасць за якасць вырабаў і арганізоўвалі прафесійнае навучанне. Так, цэхмайстры злотніцкага цэха павінны былі ажыццяўляць нагляд за тым, каб злотнікі выконвалі якасна сваю працу, а майстры не набывалі крадзеных рэчаў або няякаснае золата ці срэбра. Западозраныя ў крадзяжах павінны былі дастаўляцца ў магістрат, фальшывае золата і срэбра прадпісвалася «молатам трушчыць».

Злотнікам забаранялася залаціць «латунёвую (масянжовую) работу, асабліва тую, якая была зроблена накшталт золата». Нельга таксама было латунёвы ланцуг упрыгожваць златаванымі агнівамі, устаўляць латунёвыя «падманкі» ў пярсцёнкі, як і шкло ці простае каменне да золата асаджваць. Забаранялася «залаціць манеты». На парушальнікаў накладаўся штраф: за першы выпадак – паўгрыўны срэбра, за другі – грыўна, за трэці – дзве грыўны; далейшыя парушэнні цягнулі за сабой суд і выгнанне з цэха.

Каб стаць членам прафесійнага рамесніцкага аб'яднання, патрэбна было прайсці шлях ад вучня – праз падмайстра – да майстра. Цэх навагрудскіх злотнікаў дазваляў аднаму майстру мець не больш за трох падмайстраў («таварышаў») і трох вучняў (цырульнікам – не больш за двух). За парушэнне дадзенага правіла злотнікі падлягалі штрафу ў 1 грыўну. Вучань у злотніка павінен быў навучацца не менш за 4 гады, у цырульніка – не менш за 3 гады.

Пасля вучнёўства належала адпрацаваць у майстра падмайстрам (тэрмін службы на такой пасадзе быў роўны 2 гадам), а пасля абавязкова ажыццявіць двухгадовую вандроўку для стажыравання ў майстроў па-за межамі горада. І, нарэшце, каб стаць майстрам пасля гэтай вандроўкі, атрымаць права займець уласную майстэрню і быць прынятым у цэх, падмайстры мусілі зрабіць так званую «штуку», ці «шэдэўр». Але перад гэтым павінны былі паказаць пасведчанне аб нараджэнні ад урада таго месца, дзе нарадзіліся, і пасведчанне цэха, дзе вучыліся. Падмайстар навагрудскага цэха злотнікаў павінен быў зрабіць на працягу трох месяцаў сам, без нічыёй дапамогі, кубак з накрыўкай, пячаць з літарамі ў кола, з шлемам, ды персцень з каменем, добра асаджаным. Ад падмайстра-цырульніка патрабавалася вылячыць хворага пад наглядам

калегі-майстра. У выпадку няздачы «іспыту» падмайстар ізноў накіроўваўся ў вандроўку для павышэння сваёй кваліфікацыі. Стымул для ўступлення ў прафесійны саюз існаваў – хоць бы таму, што рамеснікаў, якія не ўваходзілі ў цэхі, называлі «партачамі», а іх вырабы звычайна прадаваліся па больш нізкіх коштах.

Пры наяўнасці цэха забаранялася займацца яго рамяством майстрам, якія не з'яўляліся членамі гэтай арганізацыі. Таму ў навагрудскія цэхі ўступілі ўсе злотнікі і цырульнікі з юрыдык замкавай, духоўнай, шляхецкай, гарадской. Аднак гэтага не маглі зрабіць «сыны лазебніцкія, цэклярскія, яўрэі і татары». Асабліва жорскімі былі патрабаванні цырульніцкага цэха, бо акрамя вышэйзгаданых асоб яшчэ і людзі простага стану, тыя, «хто ёсць не свайго права і вольнай дыспазіцыі паводле права паспалітага», не маглі прымацца да навукі цырульніцкага рамяства, таксама да публічнай і сакрэтнай справы іх не дапускалі (гэтая забарона не дзейнічала пры атрыманні вольнай ад сваіх паноў).

Апрача гэтага, злотнікам з іншых гарадоў забаранялася прывозіць і прадаваць золата, срэбра і вырабы з іх у Навагрудку падчас правядзення Трыбуналу і іншых шляхецкіх з'ездаў, а прышлым цырульнікам – увогуле займацца сваім рамяством: «галеннем, стрыжэннем, пусканнем крыві, даваннем лекаў, або якім кальвек спосабам, што ўласна навуцы і звычаям цырульніцкім прыналежыць». А купцы, як хрысціяне, так і яўрэі, не мелі права прывозіць і прадаваць абутак у Навагрудак, бо гэта было б на шкоду цэху шаўцоў.

На патрэбы аб'яднання і дабрачынныя справы ўсе яго члены выплочвалі пэўныя грошы, якія захоўваліся ў цэхавай скрынцы. Так, цырульнікі ўносілі ў казну сваёй арганізацыі кожны тыдзень па 1 грошу, а кожны квартал па 3 грошы, «таварышы» – адпаведна паўгроша і грош, «паўтаварышы» – па 1 шэлегу ў тыдзень. Шаўцы, як майстры, так і «таварышы», на нядзельнай сходцы ахвяравалі ў цэхавую скрынку па паўгроша.

Прафесійная арганізацыя не толькі абараняла інтарэсы, але і наглядала за паводзінамі сваіх членаў. Напрыклад, устава навагрудскіх цырульнікаў падкрэслівала, што майстры не могуць выходзіць «без плашча або верхняй сукні, ці з раскрытымі рукавамі, без шапкі, таксама з куфлем, кубкамі ці шлянкамі праз рынак і вуліцы», а таксама «прымаць хворага і зраненага чалавека ніякім чынам на рынку ці вуліцы», за выключэннем выпадку, калі б, ідучы па вуліцы ўначы, «натрапіў на хворага ці зраненага, лежачага на дарозе», а таварышы і паўтаварышы не маглі «пакутна» лячыць ці пускаць кроў.

Усе цэхі займаліся дабрачыннасцю. Яны выдаткоўвалі грошы на свечы ці алтары ў храмах, на дапамогу «ўбогаму брату», пахаванне сваіх членаў і наогул бедных хрысціян, а таксама бралі пад апеку ўдоў і сірот памерлых майстроў. Цэхавая ўстава цырульнікаў Навагрудка прадпісвала з брацкай скрынкі аказваць дапамогу тым майстрам, «якія праз слабасць у гадах надыйшоўшых старасці сваёй не могуць пажывення зарабіць».

Большасць пытанняў унутранага, вытворчага характару цэхі вырашалі самі, але магістраты гарадоў як прадстаўнікі ўлады займаліся рэгуляваннем іх жыцця. Напрыклад, рада Пінска 20 сакавіка 1640 г. зацвердзіла каралеўскі прывілей ад 17 лістапада 1639 г. кавальскаму цэху (злотнікі, кавалі, катляры, мечнікі). Цікава тое, што рада распаўсюдзіла дзеянне дадзенага прывілея па просьбе цэхмайстраў («а пры іх немала асоб брацііі таго») гэтага цэха на неўпісаных у ім слесараў («яка спольне да таго належачыя і брацця ўпісная») [13]. У выпадку існавання невырашальнага канфлікту ўнутры цэха гарадскі магістрат умешваўся ў справу для навядзення парадку, а ў Мінску ў другой палове XVIII ст. нават правёў працэдуру банкротства. У выніку старое аб'яднанне рамеснікаў перастала існаваць, але было створана новае.

З другога боку, у сувязі з тым, што цэхмайстры былі кіраўнікамі вытворчых аб'яднанняў, важных эканамічных аб'ектаў горада, яны ў абавязковым парадку прысутнічалі пры пасяджэннях магістрата як органа ўлады.

Увогуле, у гарадах Беларусі XVI–XVIII стст. цэхавая арганізацыя ў пэўным сэнсе садзейнічала развіццю рамесніцкай вытворчасці, выпуску якаснай прадукцыі. Цэхі спрыялі ўмацаванню прававой культуры гараджан, утварэнню адзінай юрыдычнай прасторы горада.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Стрэнкоўскі С.П. Цэхі Навагрудка як органы самакіравання // Людзі і ўлада Навагрудчыны: гісторыя ўзаемадзеяння (да 500-годдзя надання Навагрудку прывілея на магдэбургскае права): зб. навук. арт. – Мінск, 2013. С. 103–112.
2. Цітоў А. Краіна майстроў. Рамесныя цэхі Беларусі: XVI – канец XVIII ст. – Мінск, 2013.
3. НГАБ. КМФ-18 (Метрыка ВКЛ). Воп. 1. Спр. 91. Арк. 76–76 адв.
4. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 111. Арк. 103 адв – 107, 116 адв. – 622 адв., 640 адв. – 647.
5. НГАБ. КМФ-18. Спр. 99. Арк. 229.
6. НГАБ. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 106. Арк. 93.
7. НГАБ. КМФ-18. Спр. 91. Арк. 75.
8. Галоўны архіў старажытных актаў (Варшава). Архіў Фашчаў. Спр. 142. Арк 1-2.
9. НГАБ. КМФ-18. Спр. 91. Арк. 76.
10. НГАБ. Ф. 1822. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 1 – 1адв.
11. НГАБ. Ф. 1822. Воп 1. Спр. 2. Арк. 22.
12. НГАБ. Ф. 1822. Воп 1. Спр. 4. Арк. 35.
13. НГАБ. КМФ-18. Спр. 99. Арк. 229.